**Установа адукацыі**

**“Рэспубліканскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву”**

# ПЕДАГАГІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
# 02.11.2022

Выступленне

“Выкарыстанне творчых заданняў
на ўроках беларускай мовы і літаратуры”

Падрыхтавала

Іўчанкава Вольга Канстанцінаўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

Мінск 2022

# Выкарыстанне творчых заданняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Калі я слухаю- я забываю.
Калі я бачу- я запамінаю.
Калі я раблю- я разумею

Кітайская мудрасць

*Эпіграф*
Творчасць дапамагае захаваць асобу

Узровень матывацыі вучняў да вывучэння беларускай мовы з года ў год зніжаецца. Школьнікі ўспрымаюць родную мову як другую замежную. Вучні сутыкаюцца з вялікімі цяжкасцямі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры.

Таму мяне як настаўніка роднай мовы ўвесь час непакояць такія пытанні: як зацікавіць вучняў беларускай мовай, што зрабіць для таго, каб не цураліся сваёй мовы, каб разумелі яе, каб кожны раз адкрывалі нешта новае, цікавае. Як жа ажывіць урок, павысіць яго эфектыўнасць, як актывізаваць працу школьнікаў, падтрымаць іх цікавасць да прадмета?

Безумоўна, хочацца, каб ўрокі беларускай мовы і літаратуры былі разнастайнымі, каб вучні, якія наведваюць школу перыядычна (у сувязі са спецыфікай нашай установы) маглі засвоіць хаця б той неабходны мінімум, які ім патрэбны, і атрымалі станоўчыя адзнакі. Яшчэ б вельмі хацелася , каб вучні адносіліся да беларускай мовы не толькі як да прадмета, які патрэбна вывучаць у школе, а каб беларуская мова сапраўды стала роднай, неабходнай. Тым больш, што вучні РДВАР, дабіваюцца спартыўных вынікаў для нашай краіны, для Беларусі, і, атрымаўшы пера-могу, стаяць на п'едэстале, слухаючы беларускі гімн.

Мая задача як настаўніка беларускай мовы- садзейнічаць выхаванню павагі да мовы, гонару за сваю Бацькаўшчыну, спрыяць вяртанню мовы ў школьнае асяроддзе. Узнікае пытанне: як дабіцца таго, каб вучні, дзякуючы ўрокам, не проста атрымлівалі веды, а паступова станавіліся носьбітамі мовы?

Сёння, на жаль, пазнавальная актыўнасць навучэнцаў развіта слаба, адсутнічае цікавасць да вывучэння прадмета, а адзнака выступае як галоўны

стымул і асноўны вынік вучобы. Урок ператвараецца ў накапленне ведаў па тэорыі мовы, а развіццё іх уяўлення, мыслення іх асобы, творчых здольнасцей застаюцца на другім плане. Узнікае пытанне: як дапамагчы вучню вывучаць беларускую мову з жаданнем? Чым зацікавіць, як павысіць пазнавальную актыўнасць? Таму я тэмай сваёй самаадукацыі выбрала менавіта тэму "Выкарыстанне творчых заданняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры". Я стала выкарыстоўваць у вучэбнай дзейнасці творчыя заданні, якія не толькі развіваюць пазнавальную актыўнасць, але спрыяюць развіццю мыслення вучняў, узбагачаюць іх слоўнікавы запас і служаць сродкам фарміравання ведаў, уменняў, навыкаў. Таму дэвізам маёй працы сталі радкі:

*З адзінаю на кожны ўрок*

*Іду жаданай мэтай:*

*Што гэта будзе новы крок*

*Пазнання вучнем свету.*

З вопыту ведаю, чым больш вучні заняты творчым працэсам, насычаным рознымі відамі дзейнасці, тым вышэй ўзровень актыўнасці кожнага з іх: яны перажываюць свае няўдачы і памылкі і прыкладаюць намаганні, каб дабіцца станоўчых вынікаў. У сувязі з гэтым мне хацелася знайсці эфектыўныя метады і прыёмы для развіцця творчай асобы вучня. Таму мэтай самаадукацыі з'яўляецца развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў праз выкарыстанне творчых заданняў, накіраваных на актывізацыю дзейнасці вучняў, фарміраванне ў іх творчых здольнасцей, устойлівай цікавасці да прадмета.

Для рэалізацыі мэты на ўроках я выкарыстоўваю нестандартны падыход да зместу і арганізацыі вывучэння прадмета, які вядзе да актывізацыі мысліцельнай дзейнасці навучэнцаў. Нестандартнасць работы, творчыя заданні дапамагаюць абудзіць эмоцыі радасці і здзіўлення ў працэсе дзейнасці, атрымаць задавальненне ад вынікаў работы.

Творчасць − дзейнасць, якая нараджае нешта новае, што раней не было вядома, тое, што ніколі раней не існавала.

Прымаючы ўдзел у творчай дзейнасці, вучні могуць кіравацца ўзорам, могуць з многіх прапанаваных варыянтаў рашэння самастойна выбраць адзін, а могуць прыдумаць, стварыць якасна новае. Кожны вучань на вызначаным

этапе здольны да якога-небудзь з гэтых тыпаў дзейнасці ў большай ці меншай ступені. І гэта ўлічваю я, прапаноўваючы творчыя заданні на ўроку.

Падчас працы над заданнямі вучні спачатку знаёмяцца з вучэбным матэрыялам, замацоўваць і паглыбляюць веды па праграме, паказваюць уменне думаць, правільна выкладаць свае думкі, праяўляць камунікатыўныя навыкі. Творчымі з’яўляюцца любыя заданні, калі ў рабоце над іх выкананнем вучань не толькі выяўляе свае тэарэтычныя веды, але і праяўляе свае здольнасці. Навучыць гэтаму кожнага вучня класа – мая задача. І вельмі важна, каб усе цягнуліся да творчасці. Таму нават у слабенькай рабоце я імкнуся знайсці нешта станоўчае, цікавае, звярнуць на гэту знаходку ўвагу аднакласнікаў. Гэта будзе тая іскрынка, якая можна запаліць у душы вучня агеньчык творчасці А задача настаўніка- сачыць, каб ён не згас, а разгараўся.

На творчую працу я накіроўваю вучняў  ужо тады, калі даю заданні на выезд нашым спартсменам, прапануючы ім не проста выканаць практыкаванні і вывучыць пэўны параграф, а напісаць сачыненне на тэму:

- ✓ Спорт у маім жыцці
- ✓ Як я трапіў у РДВАР?
- ✓ Чаму я выбраў такі від спорту?
- ✓ Мае поспехі і дасягненні.
- ✓ Мой трэнер.
- ✓ Ці ёсць ў мяне вольны час?
- ✓ Лета спартсмена. І іншыя.

Такое сачыненне яны не знойдуць ў інтэрнеце, не спішуць, а пастараюцца прыдумаць самастойна. Я заўважыла, што вучням падабаецца пісаць пра сябе, пра свае праблемы і ўдачы, яны ахвотна ўключаюцца ў работу.  А вось для заданняў на выезд па беларускай літаратуры  часта прапаную зрабіць крыжаванку па дадзеным матэрыяле. Ацэньваю добрымі адзнакамі, бо , па-першае, такую работу нельга зрабіць не прачытаўшы тэкст, па-другое, трэба знайсці галоўнае, важнае ў ім, і па-трэцяе. праявіць творчыя здольнасці ў афармленні крыжаванкі.

Часцей вучні заўважаюць чужыя памылкі, на свае не звяртаюць увагі, таму на ўроках мовы, выкарыстоўваючы нестандартныя заданні тыпу: "Знайдзі памылку", "Гуляем у настаўніка", "Ты-карэктар" прапаную пабываць у ролі таго ж настаўніка, ці карэктара.

Пры вывучэнні арфаграфіі на ўроках беларускай мовы ў 5- 6 класах, а потым і ў старэйшых класах пры паўтарэнні, выкарыстоўваю свае ўласныя малюнкі на асноўныя беларускія правілы і прапаную прыдумаць прыклады.

Часта праводжу эўрыстычныя гутаркі. Так на ўроку беларускай літаратуры па тэме " Міфы пра багоў" у 6 класе вучні падбіраюць словы да слова РОД (галоўны Бог славян) і прыходзяць да высновы, што самыя важныя словы- народ, продкі, радня, нараджэнне, радзіма, прырода і іншыя звязаны і маюць агульнае .

У 6 класе пры вывучэнні тэмы "Ад роду да народу" вучні малююць радаводы сваіх сем'яў. А потым з задавальненнем і гонарам расказваюць пра сваіх продкаў.

Тэма "Загадкі" сама па сабе цікавая і захапляльная, бо ўсе любяць загадваць і разгадваць . А вось прыдумаць сваю загадку, намаляваць і здзівіць аднакласнікаў –гэта вельмі падабаецца пяцікласнікам.

Пры вывучэнні твора Змітрака Бядулі "На Каляды к сыну" на ўроку разглядаецца паняцце вобраз-сімвал. Гэты літаратурны тэрмін засвойваецца вучнямі лягчэй, калі яны самастойна ўяўляюць і ствараюць вобразы-сімвалы сэрцаў маці і сына.

Пры разглядзе балады А. Куляшова "Маці" вучні рыхтуюць малюнкі-партрэты сваіх матуль.

Вялікая прастора для творчасці - тэма "Свет духаў", якая разглядаецца ў 6 класе. Вучні рыхтуюць вусныя выказванні пра незвычайных герояў , надзяляюць іх рознымі рысамі , прадумваюць знешні выгляд , потым тлумачаць і абараняюць свае малюнкі з выявамі духаў.

Пры вывучэнні аповесці В.Быкава "Жураўліны крык" вучні ствараюць ілюстрацыі да твора. Уяўляюць вобразы галоўных герояў, малююць партрэты.

Карысным і цікавым на ўроках беларускай літаратуры з'яўляецца творчы прыём выкарыстання тэатралізацыі:

- чытанне па ролях(часцей у старэйшых класах пры вывучэнні драматычных твораў)
- інсцэніроўка (любяць праяўляць сваю творчасць і артыстычныя здольнасці вучні 5-6 класаў пры вывучэнні казак)
- уяўленне сябе пэўным героем

Без творчых заданняў зараз проста не абысціся, бо менавіта яны і падтрымліваюць цікавасць сучасных падлеткаў да прадмета, павышаюць матывацыю да навучання, прымушаюць думаць, праяўляць стараннасць.Важна, што такія заданні патрабуюць прыкласці вялікія намаганні, патраціць пэўны час.

Таму хочацца закончыць сваё выступленне словамі Баўржан Тайшыбекава (казахскага гісторыка і пісьменніка) **”Творчасць ствараецца з адной порцыі чарнілаў і трох порцый поту”**